CORE
Metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
Provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# Спавядальная манера аўтабіяграфічнай прозы ў выяўленні экзістэнцыяльных праблем чалавека

На матэрыяле аўтабіяграфічных твораў Ф.Аляхновіча "У капцюрох ГПУ", Л.Геніюш "Споведзь", С.Грахоўскага "Зона маўчання", "З воўчым білетам", "Такія сінія снягі", Б.Мікуліча "Аповесць для сябе", А.Адамовіча "Vixi", А.Вата "Мой век. Вусныя мемуары", дзённікавых запісаў Кузьмы Чорнага, эпісталярнай спадчыны М.Гарэцкага разглядаецца функцыя спавядальнай манеры ў выяўленні экзістэнцыяльнай сутнасці чалавека. Споведзь як жанр і як спавядальная манера і спавядальныя інтанацыі ў дзённіках, нататках, мемуарах, лістах надаюць аўтабіяграфічнай прозе моцны суб'ектыўны пачатак, скіраваны перш за ўсё на фіксацыю руху душэўных адценняў, іх непрадказальнасць і хуткаплыннасць. Спавядальная манера істотна пашырае абсягі ўспрыняцця аўтарскага духоўнага кампанента з яго абвостраным пачуццём уласнай прысутнасці ў свеце.

Аўтабіяграфічныя жанры прываблiваюць чытача дакладнай інфармаванасцю аўтара аб падзеях, сведкам і ўдзельнікам якіх ён з'яўляўся, максімальнай яго зацікаўленасцю ў фіксацыі знешняга жыцця і асабліва ўнутранага светаадчування, сцвярджэннем сваёй праваты, сваіх уласных ацэнак і высноў. Прыцягальная сіла аўтабіяграфічнай літаратуры перш за ўсё ў моцным асабовым пачатку і ў фактычнай дакладнасці рэалій, пакладзеных у структуру твора, у шчырасці і адкрытасці саманазірання, у псіхалагічнай "аголенасці" аўтарскага "я".

Найбольш прыдатнай формай самавыяўлення ў аўтабіяграфічнай прозе XX ст. з'яўляецца споведзь, якая можа выконваць як функцыю самастойнага літаратурнага жанру, так і функцыю спавядальнай манеры ў эпістальярнай, мемуарнай і іншых аўтабіяграфічных літаратурных тэкстах. Спавядальныя інтанацыі ўласцівы кожнаму мастацкаму твору, які заглыблена даследуе ўнутраны свет героя, наогул споведзі ўласціва не сума штодзённых падзей, а змястоўнасць душэўных феноменаў, іх адкрытасць і шчырасць. У свой час А.Блок звярнуў увагу на спавядальны характар вялікіх твораў мастацтва: "Я думаю, что великие произведения искусства выбираются историей лишь из числа произведений *"исповеднического"* характера" [1, с. 278]. Спавядальная інтанацыя ў аўтабіяграфічнай прозе здольна глыбей раскрыць аўтарскі духоўны кампанент, складнікамі якога з'яўляюцца і космас, і прырода, і нацыянальнасць, і эпоха, і культура.

Спавядальным творам уласціва абвостранае пачуццё ўласнай прысутнасці ў свеце. У аўтабіяграфічнай споведзі падзеі "вялікай" гісторыі могуць не мець арганічнага адзінства і насіць эскізны, фрагментарны характар, а вось "прысутнасць "псіхалогіі" ў форме самааналізу з'яўляецца абавязковай умовай" [2, с. 240]. "Весьма вероятно, что наше время — великое и что именно мы (падкр. намі. — Т.Т.) стоим в центре жизни, т. е. в том месте, где сходятся все духовные нити, куда доходят все звуки" [3, с. 69], — пісаў А.Блок. Аўтабіяграфічная проза унікальная тым, што "сам писатель делает себя, свою жизнь, собственную судьбу предметом изучения в качестве экзистенции человека и не извне, а изнутри своего Я. В своей судьбе он пытался дойти до последней сути — до сути и судьбы экзистенции человека, а в себе найти человека как такового" [4, с. 263].

Невыпадкова прыхільнікі біяграфічнага метаду ў французскім літаратуразнаўстве па-ранейшаму цікавяцца аўтабіяграфічным кампанентам прыгожага пісьменства. Жан Пам'е піша, што "свет чалавека і свет мастака ўзаемазвязаны, і іх адавочнае размежаванне немагчыма" [5, с. 88 — 91]. У артыкуле бельгійскага літаратуразнаўцы Р.Марцье чытаем: "Хто сумняваецца ў тым, што мастак прысутнічае ва ўсіх сваіх творах? Важна ведаць: якое гэтае "я і на якім узроўні яно знаходзіцца?" [6, с.47]. На асобасны пачатак у творы звяртаюць увагу і расійскія вучоныя: "Самопознание автора, художественное постижение и претворение им собственного

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

духовно-биографического опыта и черт своей индивидуальности составляет <…> неотъемлемое звено литературы <…> Актуализация этой стороны художественной тематики, происшедшая на протяжении двух последних столетий, свидетельствует об активности и зрелости личностного начала (падкр. намі. — Т.Т.) в составе культуры как таковой" [7, с. 50]. Важнасць праблематыкі аўтабіяграфічнай прозы выяўляецца праз яе суаднесенасць з вялікім цэлым. І дзякуючы гэтай суаднесенасці творы становяцца змястоўна ёмістымі і сэнсава важнымі.

Для аўтабіяграфічнай літаратуры наогул важнай з'яўляецца ўстаноўка на чытача. Жанр споведзі абавязкова патрабуе ўмоўнага ці рэальнага адрасата/чытача. Пытальныя і пабуджальныя канструкцыі ў тэкстах твораў заўсёды сведчаць аб прысутнасці адрасата. На своеасаблівы дыялог з абстрактным чытачом можа ўказваць форма "пытанне — адказ". Шматлікія пытанні ў тэксце — гэта і элемент самаадрасацыі, і жаданне выдзеліць новую мінітэму. На ўнутранай вокладцы дзённікавых запісаў ("Vixi") А.Адамовіч напісаў: "Запісы для сябе. Зрэшты, наўрад" [8, с. 305]. Прыгадаем Б.Мікуліча: "Итак, ставлю точку. "Повесть для себя"? Нет!.." [9, с. 467]. Аўтарскія прызнанні сведчаць, што дзённікавыя запісы перастаюць быць проста ўласным дакументам, а становяцца паўнавартасным мастацкім творам, не страціўшы пры гэтым важкасць аб'ектыўнага дакумента.

Споведзь заўсёды разлічана на ацэнку сябе іншым: пахвальную, асуджальную, але толькі не нейтральную. Спавядальнае слова пра сябе і пра свет у Л.Геніюш, С.Грахоўскага, А.Адамовіча адкрытае, часам палемічнае: аўтары палемізуюць з іншымі людзьмі, з другой ідэалогіяй.

Спавядальны характар мае дзённік Кузьмы Чорнага [10]. Кароткія запісы выяўляюць схільнасць аўтара да аналітыкі, але недастатковая інфармаванасць ва ўмовах ваеннага часу абмяжоўвае пісьменніка ў тым, каб правільна разабрацца ў сутнасці падзей, выявіць іх філасофскую дамінанту. І тым не менш занатоўкі Кузьмы Чорнага сведчаць аб нерэалізаванай патрэбе пісьменніцкага "я" ў самавыяўленні, аб неабходнасці блізкага духоўнага субяседніка. Беларускі пісьменнік-філасоф стаміўся ад тыражыравання ў друку шаблонных публіцыстычных артыкулаў без подпісу, ад вялікага горада Масква, ад пазбаўленай магчымасці свабодна пісаць. ("Колькі за свой век я зрабіў гэтых перакладаў і напісаў усяго, што без майго подпісу запоўнівае старонкі ўсёй нашай прэсы! І ўсё на кавалак хлеба! Хлеб наш насушчны, усіх нас пасушыць" [10, с. 519].

Вобраз Кузьмы Чорнага на старонках дзённіка паўстае як вобраз чалавека, стомленага жыццёвымі выпрабаваннямі, нерэалізаванымі марамі і надзеямі, і ў той жа час шчыра ўсхваляванага вызваленнем родных мясцін ад нямецкіх захопнікаў, уласным выздараўленнем і марай хутчэй вярнуцца дадому. "Родныя мае мясціны. Як мая душа рвецца туды! Яна заўсёды там. Там жывуць усе мае персанажы. Усе дарогі, пейзажы, дрэвы, хаты, чалавечыя натуры, пра якія я калі-небудзь пісаў. Гэта ўсё адтуль, сапраўднае" [10, с. 514]. "Чакаю хуткага пераезду ў Мінск, паспакайнець там душою, узмацнець целам і пісаць раман за раманам..." [10, с. 516].

Адлучанасць Чорнага ад беларускага асяроддзя, ад сяброў-пісьменнікаў, абмежаваная інфармацыя аб родным краі, акупаваным немцамі, паспрыялі таму, што ўвага мастака часцей скіроўвалася на агульназначныя праблемы быцця. ("...Я пачаў думаць пра вечнае — сваё..." [10, с. 519]. "Здань смерці мучыць мяне. Так я доўга не працягну" [10, с. 520]. "... Народ — гэта мільёны індывідуальнасцей, кожны з сваім індывідуальным абліччам і лёсам, хоць і падначаленым аднаму закону жыцця — нацыянальнаму і дзяржаўнаму"[10, с. 519]. "Кожная тая кніга добрая, калі яна ўзбівае чалавека на сталыя і важныя думкі" [10, с. 519]. Тут і драматызм унутранага стану, і ўраўнаважаная мудрасць розуму, і спавядальныя ноткі імгненнай плыні пачуццяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Крызісны момант рэчаіснасці: апошнія тыдні вайны на беларускай зямлі — праломлены надзвычай напружанай свядомасцю хворага пісьменніка, які прагне хутчэй вярнуцца дадому.

Прызнанні аўтарскага "я" ў аўтабіяграфічным творы носяць не проста спавядальны характар, але і ацэначны, што дае магчымасць гаварыць пра светапоглядныя ўяўленні мастака: уласнае разуменне і стаўленне да складаных перапляценняў дыялектычна супрацьлеглых якасцяў і сіл, успрыняцце свету ў руху і глыбіні. Талент пісьменніка бачыць супярэчнасці навакольнага свету і сваёй уласнай натуры істотна павялічвае магчымасць спасціжэння іх прыроды, засцерагае мастака ад догмаў і кансерватызму, сведчыць аб багацці жыццёвага матэрыялу, здольнага ахапіць усю складанасць быцця. Імкненне заўважаць схаваную канфліктнасць праблем, агаляць "двайную ісціну" (А.Блок) і ацэньваць яе дыялектычную прыроду ўласціва сапраўдным майстрам аўтабіяграфічнай прозы. Спавядальны матыў, пабудаваны на прынцыпах выяўлення антыноміі ўнутраных супярэчнасцей вобраза "я", стаў вызначальнай прыкметай беларускай аўтабіяграфічнай "лагернай" прозы (Ф.Аляхновіч "У капцюрох ГПУ", Л.Геніюш "Споведзь", С.Грахоўскі "Зона маўчання", "З воўчым білетам", "Такія сінія снягі", Б.Мікуліч "Аповесць для сябе").

Спавядальная інтанацыя ў аўтабіяграфічным тэксце можа быць узмоцнена лірызмам, які спрыяе глыбейшаму аўтарскаму самавыяўленню. І ў той жа час споведзь не ёсць поўнае адмаўленне ад лагічнага мыслення. Лагічны пачатак стварае каркас аўтабіяграфічнага твора, на які нанізваюцца імпрэсіяністычныя элементы вобразнасці, што ўласціва "Споведзі" Л.Геніюш — твору глыбока лірычнаму і полісемантычнаму. Не пазбаўлена лірызму і проза С.Грахоўскага, якая да таго ж напоўнена адметным інтэлектуалізмам. Безумоўна, лірызм празаічных твораў паэтаў Л.Геніюш і С.Грахоўскага абумоўлены пераважна паэтычным характарам іх мыслення, але важна ўлічваць і эмацыянальны напал самой тэмы даследавання, усхвалявана сур’ёзнай, балючай, па-філасофску глыбокай. Насычанасць твораў лірычнымі інтанацыямі аддаляе чытачы ад празаічных уражанняў бягучага часу і выводзіць у сферу "высокага лірычна-абагульненага" (Халізеў) асэнсавання рэчаіснасці, у сферу анталагічных праблем.

Жанравая форма споведзі з ярка выяўленым лірычным кампанентам фіксуе перажыванні, афарбаваныя агульназначнай суб’ектыўнасцю і эмацыянальнасцю. "Лирическая эмоция — это своего рода сгусток, квинтэссенция душевного опыта человека. <…> Лирическое переживание — это своего рода душевное озарение, оно являет собой результат творческого достраивания и художественного преобразования того, что испытано (или может быть испытано) человеком в реальной жизни" [7, с. 309]. У лірычных перажываннях С.Грахоўскага, Л.Геніюш, А.Вата, А.Адамовіча і інш. прадстаўлена "прывабная непасрэднасць самараскрыцця аўтара, "расчыненасць" яго ўнутранага свету" [7, с. 315].

Споведзі пісьменнікаў-паэтаў Л.Геніюш, С.Грахоўскага, якім перш за ўсё ўласціва гармонія прыродна-агульнага і асобаснага ("Душа паэта — сэйсмограф" [11, с. 130], афарбаваны элегічным смуткам, які надае асобе пазачасавую каштоўнасць. Элегічныя інтанацыі надзяляюць "я" пачуццём "индивидуальной вписанности в объективную картину всеобщего жизнесложения" [12, с. 478]. Але "при этом элегизму чужда идиллическая *безграничная* слиянность с общей жизнью. <…> элегическое учитыва[ет] как индивидуально самоценное и неповторимое, так и общезначимое, подразумева[ет] возможность сопричастности людям, природе, миру и жизни в целом" [13, с. 199].

У аўтабіяграфічных запісах Б.Мікуліча ("Аповесць для сябе") таксама ярка выяўлены лірычны кампанент, афарбаваны агульназначнай суб’ектыўнасцю і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

эмацыянальнасцю, здольнай выявіць "вышэйшыя веды" ("высшее знание") пра свет і чалавека. Нават самае дробнае, нязначнае можа стаць крыніцай вялікага. Апошнія радкі запісаў Б.Мікуліча ("Повесть для себя"? Нет! Я хочу, чтобы этот "конспект" повести был для всех, чтобы они любили и ценили жизнь и чтоб не расставались с мечтой!.. [9, с. 467]) канчаткова запэўніваюць чытача, што найважнейшай для пісьменніка была універсальная анталагічная праблематыка, здольная фіксаваць пазачасавую (вневременную) каштоўнасць асобы чалавека. Элегічнае замілаванне пісьменніка жыццём, нават паламаным, пакамечаным, раскрывае глыбінныя сутнасці "я"-асобы Б.Мікуліча.

Важным момантам у споведзі з'яўляецца яе часавая структура: аўтар можа сціснуць працяглыя падзеі, не вельмі важныя для яго, і, наадварот, пашырыць межы астранамічнага часу, калі аповед вядзецца пра душэўныя перажыванні, не падпарадкаваныя аб'ектыўнаму часу. У споведзі варта гаварыць хутчэй не пра гістарычны час, а пра час псіхалагічны, які здольны спалучыць з'явы прасторава аддаленыя. У "Споведзі" Л.Геніюш чытаем: "Цераз Польшчу пераслалі мне лісты ад мамы. Завезьлі іх недзе ў Паўночны Казахстан на станцыю Кіялы, гдзе было галадно, халадно й цяжка. <...> Я дрыжэла за маміна жыцьцё, і калі мы вечарам скуль вярталіся з мужам і холад біў мне ў твар, для мяне гэта быў холад дзікага Казахстану. <...> Францыя ляжала ўжо пакананай <...> Гераічна, амаль у адзіночку змагалася старая мудрая Англія <...>" [11, с. 41]. Польскі пісьменнік Аляксандр Ват ("Мой век. Вусные мемуары"[14]), напрыклад, часта адхіляецца ад "лагернай" тэмы і разважае наогул пра быццё чалавека, спецыфіку яго свядомасці, пра Бога і д'ябла, ролю мастацтва ў жыцці. Выхад да анталагічнай праблематыкі сведчыць аб глыбіні гуманістычных назіранняў мастака, яго духоўна-эстэтычным вопыце.

Характэрная рыса спавядальнага жанру — суб'ектыўнае ўспрыняцце часу, што цягне за сабой то яго доўжанне, запаволенасць, а то і паскоранасць. Мастацкім увасабленнем такога адчування часу прозай ХХ ст. стала фрагментарнасць. У споведзі, дзённіку ўласна біяграфічны час спалучаецца з гістарычным па-рознаму, часцей за ўсё пераважае ўласна біяграфічны час ("бытавы час" Ніколіна), можна нават гаварыць аб пераўтварэнні гістарычнага часу ва ўласна біяграфічны. Гэта становіцца ўстойлівай тэндэнцыяй сённяшняга часу: працэс экзістэнцыялізацыі літаратуры абумоўлівае дамінаванне біяграфічнага часу над гістарычным. Даследчыкі Н.Ніколіна, А.Бандарка праз аналіз моўных сродкаў інтэрпрэтацыі ідэі часу прыйшлі да вывадаў, што тэндэнцыя сучаснай аўтабіяграфічнай прозы скіравана на пераўтварэнне гістарычнага часу ва ўласна біяграфічны час, які здольны вызваліць мінулае з-пад улады тленнасці, выявіць у ім найвышэйшы сэнс і зноў вярнуць яго вечнасці [15, с. 292].

Гістарычныя падзеі ў споведзі пераходзяць у разрад спадарожных каментарыяў, у цэнтры ўспамінаў аказваецца прыватнае быццё пісьменніцкай асобы. Дамінуючая роля ўласных успамінаў пісьменніка, надзвычай адчувальнага да навакольнага свету, не памяншае ступень еднасці асобы са сваім часам, а, наадварот, актуалізуе мінулае, павялічвае ступень даверу з боку чытача да апісаных падзей.

У "Споведзі" Л.Геніюш асноўная ўвага скіравана на ўнутранае жыццё свайго "я", але немалаважнае месца ў творы займаюць знешнія падзеі, бытавыя падрабязнасці, і тут няма супярэчнасцей, бо па вялікім рахунку ўнутранае жыццё паэтэсы выяўляе сябе праз яго знешнія праявы. Злучанасць душэўнага свету "я" са знешнім здольна раскрыць глыбіні падсвядомага не горш за псіхалагічны самааналіз. Духоўны свет Л.Геніюш не дэфармуецца ва ўспамінах нават самымі пачварнымі бытавымі ўмовамі, наадварот, побытавыя праблемы раскрываюць лепшыя якасці душы жанчыны-маці, жонкі, умацоўваюць яе высокі маральна-этычны ідэал.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Спавядальная манера можа быць уласціва і эпісталярыю, які з’яўляецца арганічнай часткай мастацкай сістэмы пісьменніка. На жаль, у беларускім літаратуразнаўстве няма сталай традыцыі даследавання дадзенай жанравай формы (на гэта звяртае ўвагу В.Стральцова ў кнізе "Шлях да сябе"[16]), што паказальна як сведчанне недаацэнкі папярэднім літаратуразнаўствам суб"ектыўных форм творчасці: маўляў, гэта жанр побытавага зместу, другарадны, прыватны жанр.

Тым не менш і пры самых неспрыяльных грамадска-палітычных умовах перапіска існавала, і мы павінны шукаць і знаходзіць у ёй тое, што ўяўляе бясспрэчную грамадска-пазнавальную, мастацкую каштоўнасць. А між тым актуальнасць вывучэння эпісталярнага жанру, мемуарных, дакументальных формаў сёння відавочна ўзрастае. Тлумачыцца гэта не толькі неабходнасцю пошукаў новых звестак пра пісьменніка, але і цікавасцю да яркай творчай індывідуальнасці. "...Лісты — гэта таксама літаратурная праца, якая не павінна прападаць дарэмна" [17, с. 10], — пісаў Я.Брыль. Эпісталярная форма становіцца унікальным механізмам, які дае магчымасць актывізаваць саманазіранне. Падрабязнае расказванне адрасату тых падзей, пра якія аўтар/герой піша, ёсць форма "самавыяўлення" аўтара/героя ў зменлівых прасторы і часе.

Лісты Б.Мікуліча [9] — своеасаблівы працяг дзённіка, дзе зафіксавана сутнасць яго ўнутранага жыцця, схаванага ад сямейнікаў і адасобленага ад знешняга свету. Тут мы бачым і негатыўныя эмоцыі, і самакрытыку, і роздум над нерэалізаванымі марамі. Няпростыя бытавыя ўмовы, іх заземленасць не здольны дэфармаваць напружаны духоўны рытм асобы Мікуліча.

Эпісталярная спадчына М.Гарэцкага [18] у тым аб"ёме, у якім яна захавалася на сённяшні дзень, не дужа багатая. Прычына тут — трагічныя абставіны жыцця, трагічны лёс мастака. Лісты да жонкі склаліся ў своеасаблівы дзённік, які даваў магчымасць зафіксаваць больш-менш значныя падзеі ва ўмовах таталітарнага нагляду і цэнзуры. Лісты інфармацыйна багатыя, ім не ўласцівы адкрыты спавядальны характар, бо аўтар павінен помніць пра тое, што лісты могуць быць прачытаны цэнзурай. Каштоўнасць лістоў М.Гарэцкага ў тым, што гэта крыніца вывучэння жыццёвага шляху, аўтасведчанні і аўтапрызнанні, якія датычаць часу ўзнікнення творчых задум, падзей і здарэнняў, што паслужылі штуршком да напісання пэўнага твора. Гэта і крыніца самаацэнак, магчымасць заглыбіцца ў творчую лабараторыю, даведацца пра неажыццёўленыя планы, намеры.

Большасць лістоў М.Гарэцкага датычыць часу знаходжання пісьменніка ў Вятцы, таму пераважна пра іх і будзе ісці гаворка. Гэтыя лісты з поўным правам можна ахарактарызаваць як своеасаблівы нарыс, што істотна дапаўняе старонкі "Скарбаў жыцця", гэта і рэалістычна-бытавы варыянт алегарычна-вобразнага твора "Скарбы жыцця". Лісты вяцкага перыяду — прысуд таталітарнай сістэме, якая так несправядліва паставілася да аднаго з найбольш таленавітых мастакоў слова. Яго жыццё на высылцы — гэта суцэльнае прыніжэнне, здзек, пагарда да асобы. І сапраўды: тутэйшыя жыхары не адважваюцца браць на кватэру асуджанага "ворага народа", бо баяцца ўлады, мясцовая адміністрацыя не дае сталай працы. Сям"я ў Мінску галадае — жонка перабіваецца выпадковай працай, а трэба карміць яшчэ і малых дзетак. Бацькі выключаны з калгаса, хай сабе і на кароткі тэрмін.

Фактычна, гэта была трагедыя мастака, які і марыць не мог, каб надрукаваць пад уласным прозвішчам што-небудзь з напісанага. Не выпадкова ў ссыльнага ўзнікае жаданне назаўсёды кінуць пісьменніцкую працу, заняцца прыкладной справай. Але прага тварэння, пачуццё адказнасці за свой талент перад Богам і сваім народам, перад Бацькаўшчынай аказаліся вышэй за крыўду. "Часам находзіць на мяне вялікая злосць і крыўда, што фактычна адкінулі мяне ад літарацкае работы, як апошнюю непатрэбшчыну. Бо ці ж я магу ў сваіх цяперашніх умовах пісаць? А няўжо ж я так-такі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нічога не варты, нават з самага левага пункту погляду? І вось надоечы напісаў у Менск начальніку ГПУ, каб вярнулі мне мае затрыманыя рукапісы. Але хто там пачуе мой голас, калі я не пісьменнік, якога б нехта цаніў як пісьменніка"[18, с. 447]. "Вяцкія" лісты — найбагацейшая крыніца звестак, якая істотна ўзбагачае нашы ўяўленні пра Гарэцкага як пісьменніка-грамадзяніна, чалавека і асобу.

Найперш варта адзначыць, што асаблівай увагі заслугоўвае стыль эпісталярыя. Ён у значнай ступені абумоўлены зместам лістоў, апошні ж залежыў ад канкрэтных абставін, у якіх апынуўся пісьменнік. Агульнавядома, што лісты палітссыльных старанна цэнзураваліся, а гэта вымагала ад іх аўтара гранічнай стрыманасці, асцярожнасці, узважлівага выкладу думак і меркаванняў. Адсюль —- пэўны ўхіл у бытавую сферу (дзе жыве, дзе сталуецца, якія ўмовы працы, колькі атрымаў грошай і колькі выслаў і г. д.). Адсюль — і канстатацыйны, інфармацыйны стыль. Але і праз гэтую эмацыянальную сухасць выразна прабіваецца жорсткая, суровая праўда паднявольнага жыцця ў 1932 годзе: "У нас падняліся цэны, падаражэў хлеб, пуд мукі каштуе 40 рублёў, а служачым прадуктовых картак 1/IV у нас ужо не выдалі, — як у вас?" [18, с. 445]. "Бялізну сваю я лаплю сам; нічога, яшчэ доўга абыдуся без новай" [18, с. 439]. "Я ўсё чакаў, каб падмарозіла, але цяпер мне ўжо не бяда: купіў калёшы. Праўда, на левую нагу №15, а на правую №12, але заплаціў усяго 5 рублёў і вельмі задаволены гэтым набыткам" [18, с. 426]. Чытачы лістоў, можа, і не ўсведамляюць да канца ўсяго трагізму лаканічных сведчанняў-канстатацый. "У мяне навін няма" (27 снежня 1931 г.), "Навін у мяне няма ніякіх" (9 лютага 1932 г.). Але ж для мастака, творчай асобы вымушаная, а тым болей працяглая ізаляцыя ад знешняга свету вельмі небяспечная. Яна згубна адбіваецца на яго душэўным стане.

Вялікую каштоўнасць для даследчыкаў псіхалогіі творчасці маюць прызнанні, якія датычацца ўнутранага стану мастака, яго настрою, перажыванняў. У лісце ад 9 лютага 1932 г. М.Гарэцкі адзначае: "Я цяпер часта сню вельмі цікавыя сны. Гэтак са мною бывала і раней, напрыклад, у 1916—1917 гг. Фантастыка самая буйная і часам — вельмі страшная" [18, с. 438]. Паказальна, што перыяды інтэнсіўных сноў супадалі ў часе з надзвычай актыўнай творчай працай. Гэта значыць, у экстрэмальных жыццёвых сітуацыях актывізавалася і ўнутранае жыццё. Як бачым, тут ёсць над чым падумаць. Псіхалогія мастака, працэсы падсвядомага, моманты, якія не кантралююцца "бодрствующим" розумам, — вывучэнне гэтых з"яў дапаможа глыбей спасцігнуць законы творчасці і асобу творцы.

Наша цікавасць да эпісталярнай спадчыны М.Гарэцкага тлумачыцца яшчэ і тым, што гэтая жанравая форма — перапіска — актыўна выкарыстоўвалася пісьменнікам у мастацкіх творах як змястоўны кампазіцыйны прыём. І ў запісках "На імперыялістычнай вайне", аповесці "У чым яго крыўда?", у "Камароўскай хроніцы" эпісталярна-мемуарная форма паспяхова выкарыстоўваецца аўтарам. А, скажам, апавяданне "У чым яго крыўда?" цалкам пабудавана на прыёме ліставання герояў.

Лагічна дапусціць, што вопыт асабістай перапіскі і форма ліставання ў мастацкім творы пэўным чынам узаемазвязаны, бо гэта — плён дзейнасці адной і той жа асобы. І сапраўды, знаёмства з лістамі дае падставы сказаць, што і ў бытавой перапісцы М.Гарэцкі заставаўся мастаком слова. А некаторыя з лістоў, напрыклад ад 2 мая 1932 г., можна з поўным правам аднесці да ўласна мастацкага твора на той падставе, што пра сябе мастак расказвае ў 3-ай асобе, сябе называе Лявонам, горад Вятка ў яго — Крутагорск! Не менш паказальна, што ліст мае эпіграф ("Вяцкі народ хвацкі"). Фактычна, гэта твор, дзе ёсць пэўны сюжэт. Так, зроблена трапная замалёўка побыту жыхароў горада. М.Гарэцкі апісвае дзень, калі першамайскае свята і Вялікдзень супалі. "Яны пяклі, смажылі — хто іх ведае, да якога свята" [18, с. 447].

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Звесткі, якія падае пісьменнік у лістах, уражваюць чытача горкай бязлітаснай праўдай: гаспадары кватэры прыйшлі запрасіць Лявона да святочнага стала, а ён у той час "лапіў кашулю і штаны", мабыць, у падраным адзенні нязручна было ісці на першамайскую дэманстрацыю. Гэта ж не на працу! І тут жа яшчэ адзін штрых, які выразна раскрывае бесчалавечнасць умоў жыцця ссыльнага: "Памыцца к святу не ўдалося, бо тут праз усю зіму заўсёды была чарга ў лазню, а ў гэты дзень яна была велізарная" [18, с. 448].

Наступная дэталь яскрава характарызуе маральны ўзровень аўтара/героя. Ён паводзіць сябе ў гасцях годна: стрымаў свой "нялюдскі апетыт, каб не зменшыць лічбу ватрушак", якіх, напэўна, не так і багата было на стале. З ліста мы даведваемся і пра тое, якой была, кажучы сучаснай мовай, крымінагенная абстаноўка ў Вятцы на пачатку 30-х гг. Аказваецца, выходзіць вечарам з дому было рызыкоўна: "у гэткую пару на вуліцах Крутагорска могуць распрануць -- як піць даць" [18, с. 448]. Аўтар ліста прыкмячае мнагалюдства ў Цараўскай царкве: "І людзі розных станаў. І ўва ўсіх свечачкі ў руках". І тут жа ў свядомасці Лявона -- па кантрасту -- усплывае малюнак жыцця беларускай вёскі: "Гэта табе не цёмны закутак у палескай глушы, дзе чалавека не зацягнеш у царкву, калі верыць аўтару повесці пра Ядвісю" [18, с. 448].

Можна зразумець псіхалагічны стан аўтара ліста: галодны, у палапленым адзенні, ён, натуральна, звяртае ўвагу на рэчы, якія яго хвалююць, якія нагадваюць пра прыніжанасць: на дэманстрацыі людзі "ўсе добра прыбраныя (вядома, не па-панску), і твары ўва ўсіх здаровыя, як і ў звычайны сыты час" [18, с. 448]. Заканчваецца ліст-нарыс, ліст-апавяданне шматзначнай, можа нават сімвалічнай сцэнай — апісаннем вайсковых практыкаванняў, "Ну, самая праўдзівая вайна: грукат, страляніна, агонь, дым, газы, выбухі. Лявон ніколі нічога падобнага на практычных занятках не спадзяваўся ўбачыць, і стаяў доўга, і ўспамінаў свой 1914 год" [18, с. 448]. Так, гэта было прадчуванне хуткай і непазбежнай вайны. Толькі вайны ўлады са сваім народам. Фактычна, яна ўжо ішла, бо на календары быў 1932 год, а шматлікія ахвяры гэтай вайны знаходзіліся ў канцлагерах, у той жа Вятцы.

Не менш драматычна гучыць і сказ, якім завяршаецца апісанне ваенных практыкаванняў у мірны час: "Сёння ён (Лявон. — Т.Т.) шыў, чысціў, варыў бульбу, сушыў сухары. Заўтра на работу. І думаў пра вас. Сніў Ганначку, чаго ўжо даўно-даўно не было…" [18, с. 448]. Тут матыў трагічных прадчуванняў загучаў з асаблівай выразнасцю. Сухары сушаць, выпраўляючыся ў доўгую дарогу. Для М.Гарэцкага яна аказалася апошняй. І з"яўленне ў снах маладой Ганначкі, якая заўчасна і трагічна загінула далёка ад роднай хаты, на чужыне, у вялікім горадзе, — яшчэ адзін акорд у трагічную мелодыю.

Эпісталярная спадчына — багатая скарбніца слоў і моўных выразаў, якія не ўжываюцца ў сучаснай мове. Захаваны ў лістах і "сямейныя" словы і выразы, яны сведчаць аб духоўнай моцы сям"і, аб духоўным адзінстве сямейнікаў (подпіс пад лістамі: "Ма", "Ваш Максімішча", "Ваш Максім — дурны саўсім", "Твой Стары Дурань"). У гэтых словах адбіўся і гістарычны час, і пэўныя трагічныя этапы жыцця мастака, яго светаадчуванне. Такім чынам, пісьменніцкае "я" ўключана ў сістэму этычных самаацэнак і ацэнак іншых людзей.

Танальнасць лістоў М.Гарэцкага — не традыцыйна спавядальная. Пачуцці, настрой аўтара трансфармаваны ў візуальныя разгорнутыя карціны. Разыграныя сцэны дэталізаваны, што стварае эфект жывога пластычнага малюнка. Такім чынам душэўнае напружанне, узрушэнне, збянтэжанасць пераведзены ў зрокавы план, які разбурае спавядальны маналагізм и надае шматзначны метафарычны сэнс дробным рэчам. Прыём мазаічнай дэталізацыі ў лістах М.Гарэцкага стварае арганічны сінтэз эпічнага, лірычнага і драматычнага пачаткаў, здольных выявіць сутнасныя быційныя дамінанты,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

калі жыццё ў высылцы перастае быць толькі ўласным жыццём М.Гарэцкага, яно (жыццё) ператвараецца ў катэгорыю экзістэнцыяльную, анталагічную: жыццё паміж народзінамі і смерцю; жыццё як антыпод смерці (ва ўмовах таталітарнай сістэмы праблема надзвычай актуальная).

Мы спыніліся толькі на асобных момантах цікавай і складанай праблемы, звязанай з вывучэннем спадчыны вялікага беларускага пісьменніка, грамадзяніна і патрыёта. Элементы споведзі, уласцівыя лістам, выяўляюць маральныя якасці аўтара, складаныя супярэчнасці яго ўнутранага свету. У лістах пераважае элегічная экзістэнцыяльная канцэпцыя жыцця (індывідуальнае душэўнае жыццё М.Гарэцкага паўстае як глыбокая ўнутраная драма), праўда, яна асветлена думкамі і клопатамі пра родных людзей. Характэрная эпісталярыю М.Гарэцкага тэндэнцыя да максімальнага самараскрыцця, самаагалення праз побытавую сферу, рэаліі свайго часу, прынцып спавядальнай адкрытасці патрабаваў шчырага прызнання ў самых патаемных думках і намерах. Лісты — гэта і аўтапартрэт, і аўтаінтэрпрэтацыя асобы мастака. Яны сведчаць пра ўзмоцненую ўвагу пісьменніка да працэсаў самапазнання і самаспасціжэння.

Споведзь як жанр (спавядальная манера як жанравая дамінанта споведзі) і спавядальныя інтанацыі ў дзённіках, нататках, мемуарах, лістах надаюць аўтабіяграфічнай прозе трывалы суб’ектыўны пачатак. Споведзь скіравана не на фіксацыю вынікаў псіхалагічных працэсаў, а на рух душэўных адчуванняў, іх зменлівасць і непрадказальнасць узаемапераходаў. Спавядальная інтанацыя істотна меняе функцыю дэталі ў творы: дэталь знешняга свету становіцца псіхалагічнай дэталлю, якая выяўляе сутнасць унутранага свету чалавека. Споведзь разбурае класічную традыцыю аўтарскага ўсеведання (маналагізму) шляхам сінхроннай прысутнасці мінулага, цяперашняга і будучага часу, што непазбежна вядзе да шматаспектнага ўспрыняцця адной і той жа з’явы.

Такім чынам, у выяўлення экзістэнцыяльных праблем чалавека спавядальная манера аўтабіяграфічных твораў можа несці:

- функцыю ўзмацнення самавыяўлення (праз псіхалагічны самааналіз, лірызм, суаднесенасць прыватнай праблематыкі з вялікім цэлым, праз фрагментарную кампазіцыю)
- функцыю вызначэння эмацыянальна-ацэначных прыярытэтаў асобы (мая ацэнка сябе, ацэнка сябе другім, палеміка з іншымі, абвостранае пачуццё ўласнай прысутнасці ў свеце);
- функцыю сродаку інтымізацыі аповеду (праз лірызм ("прывабная непасрэднасць самараскрыцця" (Халізеў), элегічную інтанацыю);
- камунікатыўную функцыю (самаадрасацыя праз форму "пытанне — адказ", устаноўка на імпліцытнага чытача)

Шырокае распаўсюджанне спавядальных інтанацый у аўтабіяграфічнай прозе XX ст. выклікана паглыбленым уяўленнем аб складанасцях унутранага жыцця чалавека, нежаданнем аўтара "растварацца" ў формах агульнага і сведчыць аб багацці і змястоўнасці (менавіта "маёй") душы, якая варта стаць аб’ектам увагі іншага "я".

ЛІТАРАТУРА:

1. Блок, А. Собр. соч.: В 8 т. Т.5 / А.Блок. — М.; Л., Гослітіздат, 1962. — 799с.
2. Егоров, О.Г. Дневники русских писателей XIX века: Исследование / О.Г.Егоров. — М.: Флинта: Наука, 2002. — 288 с.
3. Блок, А. Собр. Соч.: В 8 т. Т.7 / А.Блок. — М.; Л., Гослітіздат, 1963. — 544 с.
4. Заманская, В.В. Экзистенциальная традиция в русской литературе XX века. Диалоги на границах столетий / В.В.Заманская. — М.: Флинта: Наука, 2002. — 304 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Pommier J. La Querelle / J.Pommier. — RHLF, 1967, N 1.
6. Цыт. па: Ржевская, Н.Ф. Литературоведение и критика в современной Франции: Основные направления. Методология и тенденции / Н.Ф.Ржевская. — М. "Наука", 1985. — 270 с.
7. Хализев, В.Е. Теория литературы. Учеб. 2-е изд. / В.Е.Хализев. — М.: Высш. шк., 2000. — 398 с.
8. Адамовіч, А. Vixi. Тры апошнія аповесці / А.Адамовіч. — Мінск: ТАА "Ковчег", 2002. — 504 с.
9. Мікуліч, Б. Аповесць для сябе / Б.Мікуліч // Чорны, К. Зямля: Раман / К.Чорны. Аповесць для сябе: Для сярэд. і ст. шк. ўзросту / Б.Мікуліч; Да зб. ў цэлым: Пад рэд. Л.В.Календа. — Мінск: БелЭН, 1998. С 268 — 493.
10. Чорны, К. Збор твораў у 8 тамах. Т.8. Публіцыстыка, крытычныя артыкулы, дзённік, летапіс жыцця і творчасці, алфавітныя даведнікі твораў, паказчык імён / К.Чорны. — Мінск, Маст. літ., 1975. — 616 с.
11. Геніюш, Л. Споведзь / Падрыхт. тэксту, прадм., камент. М.И.Чарняўскага / Л.Геніюш. — Мінск: Маст. літ., 1993. — 271 с.
12. Тюпа, В. Художественность / В.Тюпа // Введение в литературоведение. — М., 1999. С. 478.
13. Беляева, И. Идея бесконечности в "стихотворениях в прозе" И.С.Тургенева / И.Беляева // Художественный текст: Восприятие. Анализ, Интерпретация. № 5. — Вильнюс, 2006. С. 195—200.
14. Ват, А. Мой век. Устные мемуары. (Фрагменты книги.) / А.Ват. Перев. с польского Н.Каменевой. Предисловие Чеслава Милоша. // Иностранная литература. №5. 2006. С.173-245.
15. Николина, Н.А. Поэтика русской автобиографической прозы: Учебное пособие / Н.А.Николина. — М.: Флинта: Наука. 2002. — 424 с.
16. Стральцова, В.М. Шлях да сябе: Сучас. аўтабіягр. проза як маст. сістэма / В.М.Стральцова. — Мінск: Бел. навука, 2002. — 112 с.
17. Брыль, Я. На людях и наедине с собой / Я.Брыль. // Нёман. 1997. № 2. С. 10 — 46.
18. Гарэцкі, М. Творы / М.Гарэцкі. — Мінск, Маст. літ., 1990. — 630 с.



**Tarasova T.N. "Confessional manner of the autobiographical prose in showing up the existential problems of a human being".**

Functions of the confessional manner in showing up the existential essence of a human being are investigated on the base of the autobiographical works by Alekhnovitch "In the GPU Claws", by L. Gueniush "Confession", by S. Grakhovski "The Area of the Silence", "With the Wolf's Card" and "Such Blue Snows", by B. Mikoulitch "The Novel for "Myself", by A. Adamovitch "Vixi", by A. Vat "My Century. The Verbal Memoirs", by K. Cherny diary writings and by the epistolary heritage by M. Goretski. Confession as a genre and confessional manner, and intonation in diaries, memoirs, letters make the autobiographical prose very subjective: its aim is to fix changes in the movement of the soul, their unpredictability and transience. The confessional manner enlarges substantially the boundaries of perception of the authors' spiritual component with its acute sense of presence in the world.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ